Источник: "Культура" - 2020-02-22



# Скажыце ёй: "Люблю!"

**Усё правільна, родную мову не выбіраюць, яе любяць і шануюць, як сапраўдных бацькоў. Так што скажыце ёй (сёння, заўтра і заўжды): "Люблю!" І зрабіце гэта па-беларуску. Менавіта так ставяцца да роднай мовы ў нашай культуры.**

Яўген РАГІН

Вось якія акцыі прайшлі ў сталіцы 21 лютага. У Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа рэалізоўваўся праект "Дзясятка — за Коласа!" Ахвотныя пісалі дыктоўку па творах Песняра. Пры гэтым трэба было адказаць, з якога канкрэтна твора ўзяты ўрывак. Хто справіўся з заданнямі на "дзясятку", той атрымаў сувеніры. А была яшчэ інтэрактыўная гульня-віктарына "Жывы класік". Больш за тое, у свой час музей запрашаў далучыцца да акцыі "Маё беларускае слова" ў Instagram. Для гэтага трэба было згадаць беларускае слова, якое выклікае ў вас усмешку замілавання; падабраць да яго фотаілюстрацыю; змясціць усё ў сетцы пад хэштегам **#movakolas**. Пераможцы таксама вызначаліся 21 лютага.




У любові да мовы прызнаваліся і ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры. Тут прайшоў першы этап (чытанні) II вучнёўскай навукова-практычнай канферэнцыі "Беларусь, ты збудавана з беларускіх слоў!" Старшакласнікі ўстаноў агульнай сярэдняй і сярэдняй спецыяльнай адукацыі сталіцы і Мінскай вобласці працавалі ў трох секцыях: мовазнаўчай, літаратуразнаўчай і краязнаўчай. Партнёрамі канферэнцыі сталі інстытуты мовазнаўства і літаратуразнаўства Нацыянальнай акадэміі навук ды Саюз пісьменнікаў Беларусі.

А ў прэс-цэнтры Дома прэсы ў той дзень наша мова вяла рэй на прэс-канферэнцыі "Роля мастацкага перакладу ў міжкультурным дыялогу. Сумесныя праекты пісьменнікаў ЗША, Ізраіля і Беларусі".

Зразумела, гэта далёка не ўсё тое, што было зроблена ў краіне для ўшанавання матчынай мовы.

***Пра рэгіянальныя мерапрыемствы чытайце ў аглядзе пісьмаў на старонцы 10 "К".***